ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Чырвоная Зьмена

№ 235 (1292) | ПЯТНІЦА, 10-га кастрычніка 1930 г.

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90
6 месяцаў	1 р. 80
1 год	3 р. 30

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

...ДАРНЫ КВАРТАЛ БАЛЬШАВІЦКАГА ШТУРМУ

Зараз ужо дастаткова выкрыты ...сна-опортуністычны характар ...глуздай балбатні, быццам пера...сеньне гаспадарчага году на 1-е ...дзеня азначае адтэрміноўку для ...каторых адстаўшых гаспадарні...ў, „непасьпеўшых“ выканаць да...нае ім заданьне на другі год пя...годкі. Тым ня менш знаходзяцца ...чэ людзі, якія разглядаюць так...ны асобны, прамежны квартал ...астрычнік-сьнежань 1930 году), ...стварыўся з прычыны гэтага ...ранясеньня, як своеасаблівую пе...дышку. Такія настроі павінны ...рымаць самы бязьлітасны баль...віцкі адпор.

...Пачаты квартал зьяўляецца не ...арталам перадышкі, а ўдарным ...арталам бальшавіцкага штурму. ...ічэ няма канчаткова зьверстаных ...квартал кантрольных лічбаў, ...абрысы агульнага гаспадарчага ...ану намечаны з дастатковай да...днасьцю. Устаноўлена квартальн...я програма для Донбасу— ...27 млн. тон вугалю, у той час ...а ўвесь мінулы год Донбас даў ... млн. тон, пры пляне ў 40 млн. ...н. Мэталюргічныя заводы павін... выплавіць у гэтыя тры месяцы ...ыш паўтара млн. тон чыгуну і ...ыш 1,8 млн. тон сталі.

Выкананьне гэтай програмы будзе ...начаць буйны крок наперад і ўз...мненьне асноўнай базы індустры...ізацыі—вугалю і мэталю. На гэ...й базе вырастае далейшы рост ...шынабудаўніцтва.

Аб'яднаньнямі ВСНГ намечан на ...обы квартал па цяжкім машына...даўніцтве выпуск продукцыі на ...9 млн. руб., што азначае рост ...аль на адну трэцюю частку ў ...раўнаньні з чацьвертым кварта...м закончыўшагася гаспадарчага ...у, і па сельска-гаспадарчым ма...набудаўніцтве—150 млн. руб. ...ст на 70 проц.).

У бліжэйшыя месяцы крывая ...кананьня пляну прамысловасьцю ...кам і кожным прадпрыемствам ...собку павінна паказаць рух уго...які ня спыняецца ні на адну ...імгненьне. Між тым зараз мы на...аем некаторыя хістаньні і ня...ойлівасьць у рабоце такіх буй...ных прадпрыемстваў, як на...клад, Днепрапятроўскія заводы ...Пятроўскага і Дзяржынскага.

Асобы квартал пачаты пад зна...м ударніцтва. У адзнаку першага ...Усесаюзнага дня ўдарніка „Праў...“, „Труд“, „Рабочая газета“, ...„Индустриализацию“ і інш. ...тральныя газэты, па ініцыятыве ...інградзкага заводу імя Сталіна, ...анізавалі ўсесаюзны конкурс на ...шае прадпрыемства прамысло...сьці, транспарту і соц.земляроб...ва па выкананьню заданьняў ...ршага кварталу. Усесаюзны кон...рс зьявіцца генэральнай правер...й таго, як кіруючыя організацыі ...нглі на практыцы рэалізаваць ...азу ЦК і як глыбока яна правікла ...масы, агрэгаты, шахты, капаль...і інш.

...Друку ў конкурсе належыць кі...ючая роля. „Уральский Рабо...й“, „Рабоч. суд“, „Рабочий край“, ...„Ниж. коммуна“ і іншыя абласныя ...раёныя газэты ўжо пачалі пад...тоўку да конкурсу. Зусім пра...льна пасышла да гэтай справы ...акцыя „Уральскаго Рабочего“, ...арадкаваўшы яму пачаты га...й 3-х месячны паход „за во...гам“. Такое ж паведамленьне ...ымала ад газэты „Чырвоны ...рнік“, якая ўключыла ў кон...курс разгорнуты ёю масавы чырвонавьвёздны паход.

У барацьбе за прамфінплян друк высунуў шмат новых форм работы, якія дапамагаюць організаваць актыўнасьць мас на вырашэньне велізарных вытворчых задач, якія стаяць перад прадпрыемствамі. Усесаюзны конкурс служыць тым рэчышчам, куды зьліваецца ўся работа газэт у гэтай галіне.

Якую мэту праследуе конкурс? Выявіць лепшыя нашы прадпрыемствы прамысловасьці і транспарту (таксама, як і лепшыя саўгасы і калгасы) для таго, каб іх вопыт, іх дасягненьні перадаць іншым. Разнастайныя формы і мэтады масавай вытворчай работы газэт менавіта на гэтым павінны атрымаць праверку. І наш друк, які ў цэлым на вонцы конкурсу павінен палепшыць і ўзьняць на больш высокую ступень сваю работу організатара мас для вырашэньня баявых задач нашага соцыялістычнага будаўніцтва, зараз павінен быць на чале барацьбы мас, якая разгортваецца шы[ро]ка [на] фронтам, на перамогу над цяжкасьцямі, за далейшыя посьпехі.

Партыя расцэньвае працу друку і кожнай газэты па тым, наколькі яна змагла стаць на чале гэтай работы, стаць сапраўдным організатарам шырокіх мас, наколькі друк сапраўды па-баявому вядзе наступ рабочае клясы, дапамагае масам дабіцца новых і новых посьпехаў. Дзеля гэтага ўвесь друк, пачынаючы ад цэнтральных і канчаючы фабрычна-заводзкімі газэтамі організацыяй конкурсу павінен стварыць моцны адзіны пераможны фронт соцыялістычнага наступу ў барацьбе мас за пяцігодку ў 4 гады, за суцэльную колектывізацыю СССР і за ліквідацыю кулацтва як клясы за баявыя лёзунгі XVI партзьезду.

Першынства ў конкурсе—„справа гонару“ кожнага прадпрыемства. Адсюль гаспадарчыя кіраўнікі, партыйныя і профэсыйныя організацыі павінны зрабіць адпаведныя вывады.

Наша соцыялістычнае будаўніцтва, разгорнуты наступ на капіталістычныя элемэнты працягваецца наперакор адчайнаму супраціўленьню ворагаў, наперакор усім наскокам правых і „левых“ опортуністых на генэральную лінію партыі, наперакор усім опортуністычным хістаньням у паасобных зьвеньнях савецкага апарату і партыі.

Плян асобага кварталу павінен быць выкананы і перавыкананы. Для гэтага трэба мобілізаваць масы, упягнуць новыя мільёны ў соцспаборніцтва і ўдарніцтва, мобілізаваць нашыя неабсяжныя ўнутраныя рэсурсы, узмацніць барацьбу з бюрократызмам і расхлябанасьцю, перабудаваць на справе працу ўсіх організацый на прадпрыемствах.

Гэтая задача конкрэтна стаіць перад кожным прадпрыемствам, перад кожным саўгасам і колгасам. Яна павінна быць вырашана як-бы там ні стала.

З перадавой „Правды“ па радыё.

ІНФОРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

8 і 9 кастрычніка адбыўся пленум ЦК ЛКСМБ сумесна з сакратарамі РК ЛКСМБ, на якім былі абгавораны даклад тав. **Палякова** аб ліквідацыі акруг і задачах ЛКСМБ, даклад тав. **Рындзіча** аб скліканьні X зьезду ЛКСМБ і правядзеньні райконфэрэнцый.

У сувязі з пасылкай на вучобу, пленум аслабаніў ад абавязкаў члена бюро і кандыдата ў члены сакратарыяту ЦК ЛКСМБ—старшыню ЦБ ДКО тав. **Буклей** і зацьвердзіў старшынёй ЦБ ДКО тав. **Гайдукевіча**.

У сувязі з адклікаяьнем ЦК КП(б)Б на партыйную работу тав. **Шоламава**, пленум аслабаніў яго ад абавязкаў члена бюро і сябра сакратарыяту ЦК ЛКСМБ і загадчыка аддзелу адукацыі і быту і ўвёў у склад Пленуму і бюро ЦК і зацьвердзіў загадчыкам аддзелу адукацыі і быту тав. **Рубенчыка**.

У сувязі з пасылкай на вучобу т. **Джэлюка** пленум аслабаніў яго ад абавязкаў члена бюро ЦК і рэдактара газэты „Чырвоная Зьмена“ і ўвёў у склад пленуму і бюро ЦК т. **Самуціна** і зацьвердзіў яго рэдактарам газэты „Чырвоная Зьмена“.

Пленум зацьвердзіў сябрамі сакратарыяту т. **Рамізэвіча** і кандыдатамі ў члены сакратарыяту т. **Гайдукевіча** і **Рубенчыка** і перавёў з кандыдатаў у сябры бюро т. **Гуткіна**.

Пленум увёў у склад членаў рэдколегіі „Чырвонай Зьмены“ тав. **Янковіча, Глезера і Пузікава**.

Пацьверджана пастанова бюро ЦК ЛКСМБ аб правядзеньні раённых конфэрэнцый з 15 кастрычніка па 5 лістапада і скліканьні ўсебеларускага зьезду ЛКСМБ 15 лістапада.

Вырвем з кіпцюроў сьмерці рэволюцыйных рабочых

ВАРШАВА. Цэнтральны камітэт організацыі МОПР у Польшчы, Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі выпусьціў адозву ў сувязі з сьмяротным прыгаворам у Бяла-Падляскай тром рабочым, якім прыпісвалі забойства правакатара. У адозьве гаворыцца:

„Пад націскам лютуючага гаспадарчага крызісу і нарастаючай рэволюцыйнай хвалі, фашысцкі ўрад шукае выхаду з катастрофічнага становішча. Ён імкнецца дасягнуць гэтага шляхам узмацненьня крывавага тэрору і падрыхтоўкі вайны супроць СССР. Окупаваная Заходняя Украіна і Заходняя Беларусь, якія павінны стаць плацдармамі будучай вайны з СССР, дзіка гвалтуюцца войскам, жандармэрыяй, а таксама паліцыяй. Так званая „антысавецкая кампанія“, якая падтрымліваецца ўсім фашысцкім лягерам, уключаючы і ППС, карныя экспэдыцыі супроць украінскіх сялян (у экспэдыцыі бярэ ўдзел 2000 паліцэйскіх і кавалерыйскі корпус), сыстэма контрыбуцый, заложнікаў, забойствы, зьнішчэньне цэлых вёсак,—усё гэта зьяўляецца помстай польскага фашызму украінскаму сялянству, якое змагаецца супроць польскай окупацыі. Тэрор перавышае славутыя царскія карныя экспэдыцыі 1905 г.“

Адозва заклікае да шырокай кампаніі протэсту як у Польшчы, так і за граніцай (ТАСС).

Інтэрв'ю Тэўфік-Рушды-бэя з прадстаўнікамі друку

Стамбул 8-X. Тэўфік-Рушды-бэй, які вярнуўся ў Турцыю, у інтэрв'ю з прадстаўнікамі друку заявіў: „Я вярнуўся по насьцю задаволены маім падарожжам у СССР. Я вельмі задаволен выказам прыязьні і сымпатыі да мяне з боку савецкага ўраду і таксама заяўляю, што ўсе нашы перамовы адбываліся ў атмосфэры ўзаемнай дружбы. У часе падарожжа я навочна пераканаўся ў велізарным прогрэсе і, у прыватнасьці, у разьвіцьці прамысловасьці ў СССР. Значна разьвіваюцца і іншыя галіны савецкае гаспадаркі. Перамовы паміж СССР і Турцыяй аб заключэньні гандлёвага дагавору прадаўжаюцца, але асноўныя пытаньні ўжо вырашаны“.

ПАД АБСАЦАМ ПІЛСУДЗКАГА

Заходняя Украіна—плацдарм крывавожэрнага фашысцкага пагрому

Сусьвет ускалыхнуты магутным пролетарскім протэстам

Масавыя вобыскі і экзэкуцыі ня спыняюцца

ВАРШАВА. „Уціхамірваньне“ Заходняй Украіны—у поўным разгары. Масавыя вобыскі і экзэкуцыі ня спыняюцца. Урадавая ўлада і украінскія буржуазныя партыі ўсяляк імкнуцца затушаваць разьмеры рэволюцыйнага руху і скрыць характар дзейнасьці карных ваенных і паліцэйскіх атрадаў.

Дзеля гэтага поўнае ўяўленьне аб тэроры, які мае на мэце разграміць нацыянальна-вызваленчы і сялянскі рух на Заходняй Украіне, яшчэ немагчыма, аднак, нават тыя нямногія весткі, якія прасочваюцца, ня гледзячы на ўважлівасьць цэнзуры і скажэньні, якія робяцца польскімі інформацыйнымі ўстановамі і згодніцкай украінскай буржуазіяй, малююць зусім немагчымую па разьмерах, нячуваную па бесцэрамоннасьці і перавышаючую ўсё, што было да гэтага часу ў Польшчы па крывавожэрнасьці, карціну ўсеўкраінскага пагрому.

Карная рука абрушылася з аднолькавай ярасьцю на ўсе без выключэньня украінскія організацыі: грамадзкія, гаспадарчыя, школьныя і культурна-асьветныя. Грамадзкія організацыі зачыняюцца. Працаўнікі гэтых організацый томяцца ў турмах. **Маёмасьць украінскіх коопэратываў поўнасьцю зьнішчаецца.** Як правіла, пасьля вобыску ва украінскіх чытальнях і бібліотэках застаюцца сьляды самага барбарскага зьнішчэньня. Украінская кніга расцэньваецца, як дынаміт. **Разгромы школ**—тыповае зьявішча, якому спадарожнічаюць масавыя арышты украінскае школьнае моладзі.

Насельніцтва тэрорызавана да апошняй ступені. Мэтады кругавой парукі даведзены да ўзроўню закону. **Цэлым валасьцём умяняецца ў абавязак насьці ахову і адказнасьць за захаванасьць маёмасьці польскіх абшарнікаў.** Масавыя зьбіеньні і порка сялян зьявішча штодзённае. Зьдзекі карных атрадаў над сялянскім насельніцтвам перавышаюць нават тое, што мела месца ў час яўрэйскіх пагромаў, якія былі організаваны царскай уладай. Масавыя „выпадковыя“ выбухі бомб і адзкіх машын ва украінскіх установах дапаўняюць малюнак масавага тэрору. **Насельніцтва ў жаху перад набліжэньнем атрадаў, кідае свае ўбогія пажыткі і хаваецца тыднямі ў лясох.**

Сьляды пэнзарскага алоўка — аграмадныя белыя плямы на старонках рабоча-сялянскага украінскага друку—зьяўляюцца нямымі сьведкамі крывавай украінскай эпопэі, памеры і дэталі якое могуць быць высьвечаны толькі на працягу часу. Масавыя арышты і вобыскі працягваюцца.

Сьмерць фашызму

Агульны сход рабочых друкарні „Зьвязда“ ва ўхваленай рэзолюцыі з абурэньнем протэстуе супроць нячуванага па сваіх зьверствах усеўкраінскага пагрому, організаванага польскім фашызмам.

Сход констатуе, што украінскія **грамадзкія гаспадарчыя, школьныя і культасьветныя організацыі разгромляюцца і закрываюцца.** Работнікі гэтых організацый кінуты ў турмы. **Разгром школ і арышт вучнёўскае моладзі, масавыя зьбіеньні і лупцаваньні сялян — штодзённае зьявішча.** Украінская кніга расцэньваецца, як дынаміт. Масавыя выбухі бомб і пякельных машын ва украінскіх установах дапаўняюць малюнак масавага крывавага тэрору. Ад жахлівых расправаў фашысцкіх карных атрадаў сялянства цэлых валасьцей вымушана шукаць ратунку ў лясох.

Такімі крывавымі мерамі імкнецца польскі фашызм задушыць узрастаючы рэволюцыйны рух украінскіх працоўных мас, якія даведзены **да роспачы дзікай калёніяльнай эксплёатацыяй, а таксама нячуваным соцыяльным і нацыянальным прыгнечаньнем.**

Дарэмныя спробы! Няхай ведаюць фашысцкія каты, што ніякім крывавым тэрорам польскаму фашызму ня ўдасца задушыць рэволюцыйнага руху працоўных мас Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. Польскаму фашызму не павярнуць кола гісторыі назад!

Агульны сход рабочых друкарні „Зьвязда“ зварачваецца да пролетарыяту ўсяго сьвету з заклікам **узьняць свой рашучы голас протэсту супроць крывавага ўсеўкраінскага пагрому,** організаванага польскім фашызмам.

Прэч крывавую фашысцкую дыктатуру Пілсудзкага!

Сьмерць фашызму!

Няхай жыве Савецкая Польшча!

У Заходняй Украіне



Уціхамірваньне ў поўным разгары...

„ЛІХІЯ КОМУНАРЫ“-ТВАРЦЫ БАЛЬШАВІЦКІХ СПРА

„Дадзены нам працоўны сьцяг будзем моцна трымаць у руках і надалей“—заявілі комсамольцы лектыву фабрыкі „Кастрычнік“, якому перададзен пераходны сьцяг ВСНГБ

Колектыў заводу „Комунар“ абяцае ў бойках за прамфінплян адваяваць сабе права на баявы працоўны сьцяг

7-га Кастрычніка—працяг конфэрэнцыі.

Хутка зьбіраюцца ўдарнікі. Зусім нядаўна было ўсяго некалькі чалавек, праз лічаныя хвіліны іх ужо цэлыя натоўпы.

Гранем ура,
Ліхія комунары,
За новую рэспубліку,
За новыя права..

Імклівіць песьня бурнай, маладою радасьцю, плёхае ў сьцены, у столь, шукае выхаду на гулкія вуліцы.

Агалашаецца працяг конфэрэнцыі і штурмавы настрой аўдыторыі сьціхае. У залі ціха, ціха... Можна пачуць найменейшы свой шолах.

Першым у спрэчках мае слова делегат конфэрэнцыі з заводу „Комунар“—тав. **Плашчынскі**.

Завод „Комунар“ выканаў свой гадовы прамфінплян на 103,9 проц., а за верасень месяц — на 123,4 проц. Такім чынам, мы з посьпехам ліквідавалі наш чэрвеньскі прарыў. Мы стварылі вакол яго грамадзкую думку, на шэрагу сходаў ставілі пытаньне аб соцспаборніцтве, ударных брыгадах, добра прапрацавалі адозву ЦК УсеКП(б). У выніку—730 **чалавек уцягнута ў ударную працу**, 516 **чалавек закантрактавана на заводзе да канца пяцігодкі (комсамольцы—на ўсе 100 проц.), маем 17 ударных брыгад, 9 вытворчых комун (2 комсамольскія), 4 скразныя брыгады. Узнагароду—працоўны сьцяг—будзем трымаць моцна ў сваіх руках.**

Тав. Вікторын (Белдзяржбуд) Нам надзвычайна цяжка працаваць з-за нашай раскіданасьці. Мы вядзем 18 пабудоў у розных кутках Менску. З усіх пабудоў мы ня выканаем к тэрміну толькі аднае — „Эльводу“, Эльвод мы павінны здаць да 5-га кастрычніка, а здамо 25-га. На Меншвэі пабудова будзе выканана к тэрміну, гарадок здалі некалькімі днямі раней.

У нас яшчэ дагэтуль ня складзен прамфінплян таму, што мы залежым ад месца працы.

Агульны будаўнічы плян выкананы на 70 проц. Але зважаючы на тое, што наш будаўнічы год канчаецца не цяпер, а 31-га сьнежня, што нам да канца году засталося яшчэ 3 месяцы,—мы свой плян будаўніцтва перавыканаем. У нас закантрактавана да канца пяцігодкі 700 чалавек. Маем 600 ударнікаў.

Тав. Хобат (ф-ка „Комунарка“)—На ф-цы працуе 120 чал. моладзі з якое 80 проц. комсамольцаў. Кожны месяц выконваем свой прамфінплян на 8-10 проц. гадовага заданьня.

Пасьля прапрацоўкі адозвы ЦК склалася скразная брыгада. На прыкладу гомельскіх друкароў, наша фабрыка першай падхапіла вытворчыя манэўры, якія працягнуцца тры месяцы. Просім ня здымаць нас з сьпісу на атрыманьне баявога і працоўнага сьцягу.

Вэйнштэйн (Белжылсаюз)—Калі Белжылсаюз будаваў летась толькі на адзін мільён рублёў, дык сёлета саюз будуе на 6 мільёнаў рублёў. Летась было 250-300 рабочых а сёлета маем 1600 рабочых.

Спраўляемся з працай па—ўдарнаму. Усебеларускі стадыён закончылі к тэрміну, ЦІП (Цэнтральны Інстытут Працы) таксама здамо ў эксплёатацыю к тэрміну, ня гледзячы на цэлы шэраг перашкод (не хапае апалу і інш). Ваенвед закончылі раней тэрміну. Комсамольская ячэйка і частка беспартыйнай моладзі замацавалася на пабудовах Белжылсаюзу да канца пяцігодкі.

Екельчык (РК КСМ) — Наша конфэрэнцыя падышла да працы зусім дзелавіта. Мы можам ганарыцца тым, што на сёньнешні дзень маем цэлы шэраг комуністычных тэмпаў і мэтадаў у працы.

Шпэктараў (Сэкратар ФРК партыі).

— Рабочая-моладзь павінна быць заўжды першым застрэльшчыкам у будаўніцтве. Клеймуйце ганьбай прагульшчыкаў, ілжэ-ўдарнікаў.

У гэтым кварталі Фрунзэўскі раён аб'яўляе паход за рабочыя прапановы. Тут моладзь павінна быць першым ініцыятарам.

Тав. Клімковіч (Ц.С.П.С.Б.)—Калі ў нас наглядаецца шэраг прарываў на фабрыках і заводах, дык гэта віна тых профсаюзных партыйных і камсамольскіх організацый, якія мала ўвагі аддалі культурна-грамадзка-выхаваўчай працы сярод рабочых таго альбо іншага прадпрыемства.

Ударнік на прадпрыемстве павінен быць ня толькі ўдарнікам па выкананьню працы, ён павінен быць ударнікам і па зьнішчэньню прагулаў, барацьбітом з лятунствам, ілжэўдарніцтвам і ўсім, што перашкаджае роўнатактнаму пульсу фабрыкі і заводу.

Наша конфэрэнцыя павінна зрабіць пачатак паходу за культурную працу.

Пасьля спрэчак конфэрэнцыя заслухала заключнае слова тав. Васкабойнікава.

Пяціхвілінны перапынак.

Абвяшчаецца передача працоўнага сьцягу.

Цішыня... Максымум увагі прамове загадчыка агітмасавым аддзелам Фрунзэўскага райкому партыі—тав. **Скарахода**.

— Камісія ў складзе прадстаўнікоў райкому КП(б)Б, райкому комсамолу, ЦК ЛКСМБ і ВСНГ БССР—кажа тав. **Скараход**—пры разглядзе пытаньня аб узнагародзе лепшага комсамольскага колектыву працоўным сьцягам кіравалася наступным: **наколькі той альбо іншы колектыў правёў у жыцьцё адозву ЦК УсеКП(б) і ЦК УсеЛКСМ, наколькі колектыў справіўся з выкананьнем прамфінпляну другога году пяцігодкі і як той альбо іншы колектыў выяв ў сябе ў соцыялістычным будаўніцтве. Узважыўшы ўсё гэта, камісія журы знайшла мэтазгодным узнагародзіць працоўным сьцягам комсамо колектыў фабрыкі „Кастры**

Колектыў гэтае фабрыкі, бол іншы колектыў, заслугоўвае г сёньнешні дзень.

Адказнае слова ад комсамо га колектыву „Кастрычніка“ маў сакратар колектыву тав. Х

— Таварышы! Атрымоў гэты сьцяг мы запэўніваем Ф скі Райкампарт, ВСНГБ і ЦК самолу Беларусі, што горда па пад ім комсамольскую і бесп вую моладзь на пасьпяховае нае перавыкананьне прамфі ў пятым квартале, павядзе барыкады пасьпяховага вык ня і перавыкананьня ўдар трэцяга году пяцігодкі.

Да гэтага часу пра сьцяг быў на „Комунары“ самольская організацыя з да гэтага намога аднес роўнадушна.

Слова бярэ тав. **Плашч** які вітае комсамольскі ко „Кастрычніка“ і запэўнівае рэнцыю:

— Гэты сьцяг не заст ца па-за шэрагамі комс скага колектыву „Ком гэта толькі наша часовая та. Комсамол „Комунар дапусьціць, каб гэты застаўся не за ім.

Уся заля ўстае і па оркестру сьпявае Інтэрнац

Тодар А

Прыклад, варты перайманьня

На заводзе „Дынамо“ брыгада комсамольца тав. Клапкова (апаратны цэх), каб ліквідаваць прарыў у цэху, працавала некалькі дзён бяз зьмены дзень і поч. У выніку прарыў быў ліквідаваны і брыгада была прэміявана.

НА ЗДЫМКУ: тав. Клапкоў за работай.

Апраўдаем атрыманы сьцяг

(З рэзолюцыі 2-й Фрунзэўскай конфэрэнцыі беспартыйнай рабочай моладзі па дакладу тав. Васкабойнікава аб гаспадарча-палітычных задачах баявога кварталу і 3-га году пяцігодкі, ад 7 кастрычніка 1930 г.)

Конфэрэнцыя адзначае, што:

1. Баявы ўдарны квартал і прыбліжэньне 3-га году пяцігодкі зьяўляецца асноўным і рашаючым вагаром у справе пасьпяховага выкананьня 5-годкі ў 4 гады, асноўным палітычным зьвяном, вакол якога павінна быць згуртавана ўся ўвага, усе сілы і энэргія комсамольскай організацыі і рабочай моладзі на ліквідацыю прарываў, на поўнае забясьпечаньне програмы 3-га году пяцігодкі, які зьяўляцца рашаючым у выкананьні і перавыкананьні бальшавіцкага пляну соцыялістычнай рэконструкцыі ўсяе народнай гаспадаркі.

Сваечасовая мобілізацыя ўсіх комсамольскіх організацый і беспартыйнай моладзі на справу рэалізацыі адозвы ЦК УсеКП(б), пастановы ЦК УсеЛКСМ і практычнае ажыцьцяўленьне кантрольных лічбаў бягучага кварталу забясьпечыць далейшыя пасьпяховыя тэмпы ў выкананьні і перавыкананьні пляну 3-га году пяцігодкі.

2. Конфэрэнцыя адзначае разгорнутасьць работы па складаньню сустрэчных прамфінпланаў на квартал кастрычнік - сьнежань па большай частцы прадпрыемстваў Фрунзэўскага раёну, вялікую палітычную актыўнасьць шырокіх мас комсамолу і рабочай моладзі па збору рабочых прапаноў, бальшавіцкі запал, які выліўся ў вышэйшую ступень ударніцкага руху—батальёны энтузіястых і інш.

Паказчыкі выкананьня прамфінпляну па цэлым шэрагу вытворчасьцяй сьведчаць аб тым, што комсамольскія організацыі і беспартыйная рабочая моладзь Фрунзэўскага раёну дзякуючы сваёй упартай працы мэтадамі соцспаборніцтва, аказаліся ўперадзе іншых раёнаў у выкананьні і перавыкананьні прамфінпляну, за што ад ВСНГБ атрымалі чырвоны сьцяг.

Конфэрэнцыя запэўнівае, што рабочая моладзь і надалей пакладзе ўсе сілы, усю энэргію на апраўданьне заслужанага сьцягу

Адначасова з гэтым конфэрэнцыя адзначае, што цэлы шэраг прадпрыемстваў, як хлебазавод, пагельныя заводы, „Эльвод“ і інш., да гэтага часу не мобілізаваў грамадзкасьць на выкананьне кантрольных лічбаў і стварэньне сустрэчных плянаў.

3. З мэтай забясьпечаньня пасьпяховага выкананьня дырэктыў партыі на 5 квартал, ліквідацыі прарываў у выкананьні прамфінпляну і бальшавіцкай сустрэчы трэцяга году пяцігодкі, райконфэрэнцыя Фрунзэўскага раёну пастанаўляе:

а) зьвярнуць асаблівую ўвагу на масавы ўдзел рабочае моладзі ва ўсёй рабоце па ажыцьцяўленьню пляну на ўдарны квартал з такім разьлікам, каб ахапіць гэтай працай 100 проц. рабочай моладзі фабрык і заводаў;

б) замацоўваць практычную працу ва ўдарным квартале зборам рабочых прапаноў і ўзяць над імі шэфства;

в) конфэрэнцыя абавязваецца мобілізаваць усю беспартыйную рабочую моладзь на рашучую барацьбу з ілжэўдарніцтвам, лятунствам, прагуламі, організоўваючы байкот, грамадзкія суды над усімі, хто імкнецца падарваць наша будаўніцтва.

г) Усе ўдзельнікі конфэрэнцыі замацоўваюць сябе на вытворчасьці да канца пяцігодкі і абавязваюцца прыцягнуць да гэтай справы ўсю рабочую моладзь.

д) Адобрыць мерапрыемствы фабрык „Кастрычнік“, „Беларускі“, друкарні імя Сталіна аб стварэньні юнкораўскіх пастоў, брыгад па збору рабочых прапаноў, організацыі батальёнаў энтузіястых і ініцыятыўна-опэрацыйных груп з мэтай перанясеньня вопыту працы на іншыя прадпрыемствы, скарыстоўваючы ў гэтай працы мэтод правядзеньня мітынгаў-пераклічак.

4. Адзначаючы бурны рост нашай прамысловасьці і выкананьне намечаных на трэці год пяцігодкі плянаў, патрабуем ад ВСНГБ забясьпечыць падрыхтоўку кадраў лепшай пастаноўкаю вучнёўства на прадпрыемствах, а так сама і організацыяй новых ФЗВ курсаў па перакваліфікацыі рабочае сілы.

5... Зьвяртаемся да райкому ЛКСМБ аб мобілізацыі лепшых ударнікаў комсамольцаў з вытворчасьці, у колькасьці 50 асоб, на працу ў коопэрацыйных установах і закрытых разьмеркавальніках з мэтай правільнага забясьпечаньня рабочых дэфіцытнымі таварам.

Другая Фрунзэўская раённая конфэрэнцыя заклікае ўсю рабочую моладзь прадпрыемстваў Фрунзэўскага раёну ўліцца ва ўдарныя брыгады для барацьбы за выкананьне прамфінплянаў, за выкананьне пяцігодкі ў 4 гады, за генэральную лінію партыі, супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі на дадзеным этапе, супроць левых загібаў і прымірэнчых адносін да іх.

ПРАЗ ВЫПРАЎЛЕНЬНЯ ПАМЫЛКІ ЛІКВІДАВАЛІ ПР

Верасьнёўская адозва ЦК УсеКП(б) аб ліквідацыі прарыву застала фабрыку „Кастрычнік“ у стане вялікага прарыву ў прамфінпляне.

Адозва ўзьняла творчы энтузіязм рабочых на ліквідацыю прарыву. Комсамольцы, партыйцы і беспартыйныя рабочыя абвясьцілі сябе мобілізаванымі на выкананьне пляну 2-га году пяцігодкі. На ініцыятыве комсамольцаў былі організаваны групы, якія выходзілі на 3-юю зьмену для ўзмацненьня слабых вучасткаў на істужцы падкладачная істужка.

Усе працавалі ў выхадныя дні, паставіўшы мэту 6-га верасьня ліквідаваць прарыў у комсамольскім агрэгаце.

Да 12-га верасьня агрэгат выканаў сваю програму на 100, Гадавая програма выкана 100,8 проц. Вытворчасьць ўзьнята на 46 проц., сабеко жан на 14 проц.

Увесь комсамольскі колект вясьціў сябе закантрактава фабрыкай да канца пяцігодк

У час прапрацоўкі суст прамфінпляну комсамольскі тыў дапусьціў опортуністыч мылку з высоўваньнем міні лічбы па зьніжэньню саб Гэтая памылка была тут праўлена; колектыў прызнаў памылку і мобілізаваў ус комсамольцаў супроць гэт строю, на прапрацоўку суст прамфінпляну на 5-ы квар

Хэй

Барацьба за кадры—рашаючае зь пяцігодкі

Дасьледчы рацыяналізатарскі рух моладзі высоўвае перад сабою мэту—аб'ядваць вакол сябе пад кіраўніцтвам комсамолу шырокія колы працоўнай моладзі для дапамогі партыі і сав. уладзе ў саўгасным і колгасным будаўніцтве. Гэтую задачу брыгады вопытнікаў і рацыяналізатараў будуць разьвязваць шляхам вышуканьня новых спосабаў павышэньня ўраджайнасьці, шляхам рацыяналізацыі і палепшаньня сельска-гаспадарчай вытворчасьці ў колгасах і саўгасах, разгортваючы ўдарніцтва, соцспаборніцтва.

Рух дасьледчыкаў-рацыяналізатараў павінен стаць крыніцай, з якое дзяржава зможа вычэрпваць дзесяткі тысяч спэцыялістых у галінах сельскай гаспадаркі.

У горадзе па вывучэньню сельскай гаспадаркі і дапамозе колгаснаму будаўніцтву, а таксама правядзеньню вопытнай і рацыяналізатарскай работы, моладзь аб'ядноўваецца ў гурткі юных натуралістых, а ў вёсках ужо некалькі год існуюць сельска-гаспадарчыя гурткі.

Наша задача перабудаваць і

Ва ўмовах колгасаў і саў лічым найбольш мэтазгодны віцьцё брыгаднай формы аб' ня.

Рух вопытнікаў і рацы тараў перш за ўсё ёсьць вотны і таму яго першапач зьвеньні (брыгады) павін вацца на пачатках паўней браахвотнасьці як па форме па зьместу асобных галін. На чале брыгады павінен вет брыгады. У кіраўніцтве павінен быць брыгадзір і гр У савет брыгады патрэбна нуць агранамаў, настаўніцт стаўнікоў праўленьня колга вет зьбіраецца па меры насьці. Сход брыгады паві рацца ня менш 1 разу Савет выбіраецца на 6 мес

Комсамольскім ячэйкам весьці рашучую барацьбу тамі педааценкі сутнасьці разгортваньня рацыяналіза руху.

Авар

НАПЯРЭДАДНІ X ЗЬЕЗДУ ЛКСМБ

Скарбонка саюзнага вопыту



ПЕРАМАГАЮЧЫ ЦЯЖКАСЬЦІ,

загальскія комсамольцы пасьпяхова адбілі кулацкія ...такі. Яны сьмела перашагнулі старыя звычаі і традыцыі

...мсамольцы „Чырвонага Кастрычніка" паказалі вузоры бальшавіцкай барацьбы за колгасы

Вучэцеся ў загальскіх комсамольцаў, не паўтарайце іх памылак

РАПАРТУЕ КОМСАМОЛЬСКАЯ ЯЧЭЙКА КОЛГАСУ „ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК"

...стаялі межы „Чыр...нага кастрычніка"

Высунутыя партыяй задачы ліквідацыі кулацтва на аснове суцэльнай колектывізацыі набылі важнейшае значэньне для комсамольскай ячэйкі. Гэты час для нас зьявіўся сур'ёзьнейшым экзаменам.

Загальле і ваколічныя вёскі закуты сярод спрадвечных балот Прыпінскага масыву. Тут яшчэ, як ніде, захавалася дзікасьць і несьвядомасьць сярод сялянства. Сярод балот і лясоў захаваліся яшчэ шмат кулакоў. Карыстаючыся закасьцю і несьвядомасьцю сялянства, кулакі хітра апляталі сваім ...утным павуціньнем вёску.

За організацыю батрацтва, беднаты і серадніакоў на барацьбу з ...акамі старымі формамі вядзеньня сельскай гаспадаркі, на барацьбу за новую, колектыўную працу ...ступілі два батракі і тры серадні... — наяўны склад Загальскай ...йкі.

У час ліквідацыі кулацтва на базе суцэльнай колектывізацыі пераважная большасьць уступіўшых ...ло ў колгас гаспадарак, а прычыны ...ушых месца перагібаў і адсутнасьці ...лай растлумачальнай працы выйшла з колгасу. У колгасе засталіся ...навальнікі яго — комсамольцы і ...тка блізкай да ячэйкі моладзі.

Цяжкасьць становішча паглыблялася слабою працай сярод беспартыйнай моладзі.

...пошуках ...вых людзей

На месцы ў нас няма парт'ячэйкі. Калі паўстала пытаньне: а ...ж у нас будзе працаваць?—мы ...вярнуліся ў Глускі райком КСМ ...просьбай дапамагчы папоўніць ...гас рабочай сілай. У РК КСМ ...ралі нам перадаць маёмасьць бліжэйшаму колгасу. У райвыканкоме—...сама.

Гэтая парада нас ні ў якім разе ...задаволіла, і мы не згадзіліся.

Мы паставілі пытаньне аб вяр...цы ў колгас. На сходзе на...й ячэйкі шмат гаварылі і на...шце, прынялі конкрэтную пастанову.

Раніцою ўся комсамольская ячэйка рушыла праз дзікія балоты Пр'інскага масыву ў паход за новымі людзьмі.

Мы хадзілі па адзінокіх раскіданых сярод непраходнай гразі, балот і вады хутарох і вербавалі батракоў у наш колгас. Такім мэтадам ...ацы за два паходы мы навербавалі ў колгас 18 батракоў.

Так мы выйшлі з тупіка, які пагражаў зрыву працы ў колгасе.

...большасьць нашых комсамольцаў згорам вынесла на сваіх плячох гэтыя цяжкасьці.

Але-ж знайшліся і здраднікі. ...-жа ведае комсамол і працоўная моладзь тых, хто ў самы адказнейшы і цяжкі момант працы колгасу здрадзіў працы колектывізацыі вёскі. Вось іх імёны:

Лешчына Алена — серадначка Скурыгін Янка, які скончыў ...мігодку і меў больш за нас ве...ці ш...у — зараз працуе ў кнігарні ў ...Глуску.

Яны адмовіліся абагульваць маёмасьць.

З клічкай здрадніка мы іх выключылі з комсамолу і колгасу.

Гэтыя часы былі пераломным этапам у працы колгасу.

Экзамен выканан

Нявялікі адцінак часу спадарожваўся ўпартай барацьбою за колгас. Мы дабіліся перамог і пачатую працу замацавалі.

Быў намечаны: плян вясеньняй пасеўнай кампаніі апрацаваць пры 18 рабочых, 118 гэктараў пахаці і 418 гэктараў сенажаці. Гэты плян сходам быў адобраны і прыняты. На гэтым-жа сходзе склалі па асобных галінах працы добраахвотную брыгаду, даручыўшы кожнаму брыгадзіру, праверыць і наладзіць сельгаспрылады, **зрабіць па адной пары лейцаў і пастронкаў, падрыхтаваць плугі.**

Першы раз колгасьнікі вышлі на штурм межаў з 8-мю парамі коняй. Уся вёска высыпала на вуліцу і, стоячы з боку, наглядала за колектыўнаю працай.

Назаўтра ўся вёска вышла араць. Сяляне на нашым першым выезьдзе ў поле ўбачылі, што мы не сабраліся гультаяваць, як аб гэтым паўзлі чуткі.

Кулакі пушчалі чуткі, што колгас пасеяў авёс, а па аўсу канюшыну, авёс ня ўзышоў, дык адсяваюць ячмень.

Знайшліся некалькі чалавек, якія не ўстаялі пад напорам кулацкай хлусьні і вышлі з колгасу.

У гэты-ж самы час наша колгасная ячэйка, упартай працай з адзінаасобнікамі, утварыла другі колгас у в. Баявічы на адлегласьці 5 вёрст.

Організаваны намі колгас — „Бальшавік Пераможца" ў 45 гаспадарак — вытрымаў з посьпехам як пасеўную, так і ўборачную кампанію.

Свой плян па вясеньняй пасеўнай кампаніі мы выканалі з значным павышэньнем. **Замест 118 гэктараў па пляну мы засеялі 175 га.**

За лепшае сканчэньне сяўбы наш колгас атрымаў ад Глускага Райпаляводсаюзу 3 жняяркі.

„Эх ды тройка..."

Галаваціяпы з Глускага раёну „дапамагаюць" колгасу. Забраўшы коняй у гарачую пару сяўбы, яны робяць прагулку да кулакоў.

Засеяць — засеялі, як убярэм?

На адным з сходаў нашага колгасу стаяла пытаньне: **Засеяць — засеялі, як убярэм?**

Плян уборачнай кампаніі агульным сходам быў даведзен да кожнага колгасьніка і брыгады. Вызначылі кожнаму колгасьніку вучастак.

На далёкія вучасткі мы паслалі брыгады, якія ў час уборкі там і начавалі.

Комсамольцы і беспартыйная колгасная моладзь у час уборкі разгарнулі паміж сабою соцспаборніцтва. **Для брыгад быў устаноўлен тэрмін для выкананьня заданьняў жніва.**

Нашымі лепшымі ўдарнікамі па ўборцы былі: батрачка Міронччык Марыля і Буклей Сьцяпан.

Колгас уборку скончыў пасьпяхова, даеўшы перавагу колектыўнай працы.

Мы ўжывалі ўсякія мэтады працы, організоўвалі нядзельнікі, прыцягваючы да ўдзелу **ў іх неколгасную моладзь**, таксама нам прышлося карыстацца часткова і наймовай сілай.

Па папярэдніх разьліках на ўборку меркавалася затраціць 2000 **чалавека-дзён**, атрымаўшы жняяркі **патрацілі толькі 600 дзён.**

Уборка сенажаці была тормазам усяе працы. Мы бярэм на сябе віну, што пытаньне касьбы ячэйка добра не распрацавала. 418 гэктараў сенажаці мы ня здолелі апрацаваць сваімі сіламі.

Сяляне-бедвякі некалькі раз прасілі аддаць ім сенажаць, але ячэйка гэтага не зрабіла і няўбраная частка сенажаці ўдарыла па аўтарытэце колгасу.

Скончыўшы ўборачную кампанію мы вылічылі, што можам даць **2 тыс. пудоў хлебных лішкаў, тады як нам была вызначана норма хлебазагатоўак у 1 тыс. пудоў.**

Акрамя таго, мы здалі дзяржаве 9 кабаноў, 45 бараноў, таксама колгасу імя Сталіна далі на абсемяненьне 2 тыс. пуд. бульбы.

Першы абмалот азімага жыта паказаў, што ўраджай наш бязумоўна большы, чымся ў адзінаасобных гаспадарках. Пры абмалоце з 15 **коп вышла 115 пуд.**

У адзінаасобніка капа дае 4-5 пуд., а мы мелі з капы больш 7 пудоў.

Пасеяны намі авёс быў самым лепшым у ваколіцы нашай вёскі і гэта быў лепшы паказ працы батрака-колгасьніка.

У той час калі ў адзінаасобнікаў з аднаго га было 50 пуд. ураджаю, у нас гэктар даў 80 пудоў.

Мы яшчэ дагэтуль не разьмеркавалі ўраджаю, бо лічылі, што колгас батрацкі карыстаецца агульнай сталоўкай і ніякага разьмеркаваньня ня трэба. Гэта пытаньне ў нас пакуль што канчаткова ня вырашана.

Пераможна гудзеў трактар

У колгас прыбыў трактар, ён зрабіў вялікае ўражаньне на вёсцы.

Усе тыя, хто раней казаў, што трактар тут у нас нічога ня зробіць, пераканаліся наколькі былі сьляпымі дагэтуль.

У Загальлі загаварылі, што калі правядуць дарогу для трактарнай калёны з бліжэйшай вёскі Соснаў Гальлё дык на весну трэ' будзе ісьці ў колгас.

У першыя 3-4 дні насельніцтва аколічных вёсак кідала працу і цэлымі групамі ішло глядзець на трактар як на нейкае дзіва.

У нядзелю пачуўся гул машын. Высыпалі ўсе з цэрквы глядзець на дзіўную дзёрскую машыну. Трактар лепшы агітатар.

Да нас уступаюць 6 новых гаспадарак.

Бедвякі і серадвякі ўпэўніліся ў моцы трактара і ўжо не сумняваюцца, што вясною на неабдымных палетках загальскага колгасу, у які з часам увойдзе ўсё Загальле, будуць гучэць пераможныя гукі трактароў, руйнуючы межы вузкіх палосак.

Мы будуемся

За кароткі час свайго існаваньня колгас пабудаваў пуню. Зараз у пуні зьмяшчаецца ня толькі колгаснае збожжа, але і паступае ўвесь хлеб сельскага савету — 9 тысяч пудоў хлебазагатовак для дзяржавы.

Комсамольская ячэйка загадзя ўлічыла нашы цяжкасьці ў вырашэньні мясной проблемы. Мы парашылі для сьвіней колгасу пабудаваць сьвінарнік. Пры складаньні пляну пабудовы сьвінарнікаў па раёне працаўнікі ня ўлічылі таго, што ў колгасе „Чырвоны Кастрычнік" маюцца ўсе неабходныя ўмовы для пабудовы сьвінарнікаў у першую чаргу. Комсамольская ячэйка высунула пытаньне — уключыць у раённы плян пабудову сьвінарнікаў.

Мы давялі раённым установам, што ў нас павінен быць сьвінарнік, і ён будуецца у 75 мэтраў даўжынёю.

Замест дапамогі — шкодзіць

Ячэйка працавала без належнага штод'ённага парткіраўніцтва. Дапамога брыгадзіраў раённых організацый была дрэнная.

У нашых колгасах былі брыгадзіры: Немцаў і старшыня глускага крэдыт-таварыства — Астэрманскі, якія нічога добрага не зрабілі, а наадварот — толькі шкодзілі. Так, напрыклад, калі добрае надвор'е, спрыяла хутчэйшаму выкананьню вясеньняй пасеўкампаніі, тав. Немцаў і Астэрманскі бралі ў колгасе рабочую жывёлу і езьдзілі да кулакоў весела праводзіць час.

Комсамольская ячэйка правільна ацаніла гэтыя ўчынкі, як падрыў у рабоце колгасу. Намі праз адпаведныя органы будуць прыняты належныя меры.

Ідзем уперад да поўнай перамогі

За пройдзены адцінак часу ячэйка „Чырвонага Кастрычніка" дасягнула вялікіх перамог па ўсіх пытаньнях, якія стаяць на шляху соцыялістычнай перабудовы нашай вёскі. Мы паказалі ўзоры ўдарнай бальшавіцкай работы.

У выніку:

З 5 комсамольцаў на працягу менш як паўгоду ячэйка вырасла і налічвае зараз 22 чалавекі, з іх па соцыяльнаму становішчу — 18 батракоў. А ўсяго ў колгасе на сёньняшні дзень 65 **чал., з іх 62 чал. моладзі.**

З усёй колькасьці колгасьнікаў — батракоў 30 чал.

Мы ліквідавалі няпісьменнасьць сярод большасьці колгасьнікаў.

Зараз у нас ёсьць усяго 3 няпісьменных, якія ходзяць на лікпункт.

Будзем і надалей перамагаць цяжкасьці

Нашы памылкі больш усяго тлумачацца тым, што наша праца праводзіцца без неабходнага партыйнага кіраўніцтва. Калісьці гэтым пытаньнем займаўся Глускі РК КП(б)Б, які меркаваў організаваць у нас кандыдацкую партгрупу, але дагэтуль гэта засталося толькі меркаваньнем. Мы чакаем, каб Глускі РК хутчэй організаваў у нас кандыдацкую групу.

Мы патрабуем больш дапамогі ад Глускага РК КСМ, бо за пройдзены час нам удзялялася зусім малая ўвага.

На грунце правільнага партыйнага кіраўніцтва і кіраўніцтва РК КСМ і раённых організацый мы зможам падняць політычны ўзровень і клясавую баяздольнасьць нашай ячэйкі і маладых колгасьнікаў, таму што прышоўшы да нас батрак-комсамолец мала і зусім слаба разьбіраецца ў політычных пытаньнях.

Мы разбурылі перагародкі старых традыцый і звычаяў. У жорсткай барацьбе з кулацтвам мы вынесьлі на сваіх плячох усе цяжкасьці організацыі і будаўніцтва нашага колгасу.

Цяпер мы сьмела можам рухацца наперад, перамагаючы і надалей цяжкасьці

Напярэдадні зьезду УсеЛКСМ і ЛКСМБ мы — батракі-колгасьнікі і комсамольцы „Чырвонага Кастрычніка" — праз кіруючы орган „Чырвоную Зьмену" заяўляем, што аддамо ўсе свае сілы і энэргію на пабудову соцыялізму.

Мы чакаем ад усебеларускага і ўсесаюзнага зьезду комсамолу далейшых заданьняў, па якіх мы не аслабна, не пакладаючы рук, будзем праводзіць на практыцы рашэньні па далейшаму будаўніцтву соцыялізму.

Сакратар ячэйкі **Сікорскі.**

Глускі раён,
б. вёска Загальле.

Паведамленьне

Прапануецца таварышам, якія вылучаны ЦК ЛКСМБ для правядзеньня райконфэрэнцый комсамолу, зьявіцца сёньня ў ЦК ЛКСМБ на інструкцыйную нараду, якая адбудзецца а 6 гадз. увеч. у пакоі сакратара ЦК.

Пасьля нарады, т. т., якія выяжджаюць у раёны, атрымаюць камандыроўкі і грошы.

Заг. орг. інстр. аддзелам
ЦК ЛКСМБ **Рындзіч.**

Падтрымаць ініцыятыву комсамолу

Нядаўна была апублікавана пастанова бюро ЦК УсеЛКСМ аб організацыі мас комсамольцаў на работу па грамадзкаму кантролю над рабочай спажывецкай кооперацыяй.

Гэтая пастанова на фоне нядаўна раскрытай шкодніцкай контррэволюцыйнай організацыі набывае выключнае політычнае значэньне.

Гэтая пастанова намячае круты паварот ва ўвазе ня толькі комсамольскіх організацый, але і ўсіх шырокіх рабочых мас да справы паляпшэньня забясьпечаньня рабочых прадметамі першай неабходнасьці і продуктамі харчаваньня.

У пастанове ЦК комсамолу ўказаны самыя падрабязныя шляхі работы комсамольскіх ячэек у кооперацыі.

У асноўным дзейнасьць комсамольскіх організацый на гэтым вучастку павінна зводзіцца да ўсямернага садзейнічаньня і практычнай дапамогі кооперацыйным організацыям у пасьпяховым і хутчэйшым разгортваньні сеткі закрытых разьмеркавальнікаў, як аднэй з форм клясавага разьмеркаваньня продуктаў і прамтавараў, утварэньня баз па дастаўцы тавараў на дом, у мэтах барацьбы з чаргою, а таксама прымацаваньнем працоўных да вызначаных гандлёвых адзінак.

У мэтах максымальнага паляпшаньня харчаваньня рабочых, якое грае вялікую ролю ў організацыі правільнага і баявога служэньня інтарэсам пяцігодкі, у справе сапраўднага падвышэньня рэальнай зарплаты, бюро ЦК УсеЛКСМ у сваёй пастанове дае ўсім комсамольцам баявы загад:

— Зрабіць заводзкую сталоўку агрэгатам свайго цэху,ператварыць буфэт у дадатковы варштат сваёй майстэрні. І сталоўку і буфэт абкружыць выключнай увагай, максымальным клопатам.

Няма повадаў і прычын сумнявацца ў тым, што комсамольцы ня справяцца з гэтымі, узятымі на сябе, бязумоўна цяжкімі абавязацельствамі.

Але ў сто разоў будзе лягчэй рабіць комсамольцам сваю гэтую вялікую справу, калі яны сустрэнуць актыўнае падтрыманьне ўсіх організацый, і ў першую чаргу профсаюзаў.

Пастанова бюро ЦК УсеЛКСМ будзе пасьпяхова і з належнымі вынікамі ажыцьцёўлена толькі ў тым выпадку, калі кожная фабрычна-заводзкая профорганізацыя кожнаму мерапрыемству комсамольцаў аддасьць адпаведную ўвагу, калі будзе ўсяляк дапамагаць комсамольскай ячэйцы і мобілізаванай ёю рабочай моладзі, браць адзін за адным бар'еры закарэнеласьці і бюрократызму.

Няма чаго таіць граха. Надта і надта многія профорганізацыі яшчэ дагэтуль не навучыліся цаніць ініцыятыву і энтузіязм нашай моладзі, не навучыліся, а часамі проста не жадаюць разумець тое, што моладзь са сваёй знароўкай і ўменьнем працаваць па-баявому зьяўляецца вялікай сілай, пры дапамозе якое можна значна лягчэй, з меншым напружаньнем, чым пры другіх умовах, перамагчы цяжкасьці, якія стаяць перад намі.

Комсамол абвясьціў паход за лепшую работу кооперацыі, за лепшае забясьпечаньне рабочых продуктамі харчаваньня і прадметамі першай неабходнасьці. Комсамол абвясьціў паход за перабудову работы кооперацыі на бальшавіцкі лад. І абавязак профсаюзаў зьверху данізу аказаць комсамолу ўсялякую дапамогу і дзейнае падтрыманьне.

А. Тайц.



Ударнай рабоце—ударны разгон

Разбівайце ўшчэнт опортуністычную стаўку на самацёк!

Усім ячэйкам і комсамольцам Самахвалавіцкага раену

Капаньне бульбы па Самахвалавіцкім раёне знаходзіцца пад пагрозай зрыву.

Яшчэ няўбрана каля 600—700 га бульбы. Асобныя комсамольскія ячэйкі яўна бязьдзейнічаюць на гэтым фронце.

Масы комсамольцаў і беспартыйнай моладзі на выкананьне гэтай работы не мобілізаваны. Работа не пераведзена на ўдарныя тэмпы.

РК ЛКСМБ прапануе ячэйкам прыняць усе захады да мобілізацыі комсамольскай організацыі і беспартыйнай моладзі, вучняў старэйшых кляс на справу хутчэйшага капаньня бульбы.

Праз кожныя тры дні інформаваць РК ЛКСМБ аб ходзе капаньня бульбы.

Сэкратар РК ЛКСМБ КЛЯБАНАЎ.

Рудзенская станцыя зрывае загатоўкі

На станцыі Рудзенск адчуваецца вялікі недахоп у грузчыках для прыёму і пагрузкі бульбы і хлеба. Чырвоныя абозы, што прыбываюць на станцыю, вымушаны стаяць цэлымі днямі, пакуль іх прымуць. Праўленьне Сьмілаўскага спажывецкага таварыства гэтымі пытаньнямі ня цікавіцца.

М—к.

„Пяцігодку—у чатыры гады“

Добра праходзіць падпіска на пазыку ў колгасе „Комінтэрн“ (Сьмілавіцкі р-н). Усе комсамольцы падпісаліся на свой месячны заработак. Таксама не адстаюць і беспартыйныя.

Таболін.

* * *

Вязёрская ячэйка (Сьмілаўскі раён), якая складаецца з 9 чалавек, падпісалася на 350 рублёў, тады як вызначанае заданьне для яе раўняецца 300 руб. Кантрольная лічба перавыканана.

Паляшук.

* * *

Жыліцкая комсамольская ячэйка, Бабруйскага р-ну, наладзіла 2 суботнікі ў карысьць індустрыялізацыі, з якіх выручыла каля 200 рублёў. Усе комсамольцы падпісаліся на пазыку „Пяцігодка—у чатыры гады“ на 75 проц. свайго заработку, што складае звыш 1000 рублёў.

Раманюк.

* * *

Рабочыя і служачыя саўгусу „Горкі“ (Сьмілавіцкі раён) падпісаліся на пазыку на 100 проц. сваёй месячнай пэнсіі, што складае 1980 рублёў. Кантрольная лічба перавыканана больш, як у два разы.

А. Собаль.

* * *

Пераро́ўскі сельсавет (Тураўскі р-н) яшчэ не мобілізаваў батрацка-бядняцкія масы вёскі на вырашэньне пытаньня падпіскі на пазыку „Пяцігодка—у чатыры гады“. Комсамольскія і партыйныя ячэйкі ў гэтым напрамку бязьдзейнічаюць, за што гавораць наступныя факты.

На Пераро́ўскім с-с ні на капейку не распаўсюджана пазыка. Старшыня с-с, тав. Кусанапаў, кажа:—„З рэалізацыяй яшчэ пасьпеем“.

Такое-ж становішча наглядаецца і ў Рыгаўскім сельсавеце.

Навальніца.

СТАЎКА НА САМАЦЁК ПАГРАЖАЕ ЗРЫВАМ БУЛЬБАЗАГАТОВАК

Па Дрысенскім раёне гадавы плян па бульбазагатоўках на 1 кастрычніка выканан толькі на 3 проц. Гэта тлумачыцца тым, што з боку партыйных і комсамольскіх ячэек, а таксама загатоўчых організацый не разгорнута растлумачальная работа. Кулацка-заможная частка вёскі ня прыцягваецца да адказнасьці за няздачу цьвёрдых заданьняў.

Па **Каркалецкім** і **Росіцкім** сельсаветах цьвёрдае заданьне да кулацка-заможнае часткі зусім не даведзена. Парт'ячэйкі тлумачаць, што па іх сельсаветах няма кулакоў (!?).

Райком партыі за правоопортуністычныя погляды распусьціў бюро Каркалецкай ячэйкі і вынес суровую вымову яе сэкратару.

Комсамольская організацыя раёну зусім стаіць у баку ад загатовак. Ячэйкі чакаюць дырэктыў ад райкому комсамолу, а той пытаньне аб загатоўках і не абгаварваў. Частоўская комсамольская ячэйка сваю бязьдзейнасьць у загатоўках тлумачыць: „Няма дырэктыў ад РК КСМ“. Дрысенская чыгуначная ячэйка пытаньне аб бульбазагатоўках зусім адмовілася паставіць, кажучы: „Загатоўкі ня наша справа, а справа партыйнай ячэйкі і сельсавету“.

Правоопортуністычныя погляды, якія выражаюцца ў стаўцы на самацёк, спасылцы на тое, што „у нас кулакоў няма“—пагражаюць зрывам загатовак бульбы ў раёне. Парткомсамольскае кіраўніцтва павінна тэрмінова мобілізаваць організацыю для рашучай барацьбы з правоопортуністычнай практыкай у працы асобных партком'ячэек і савецкіх органаў.

І. Курган.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Організавалі штаб і прыступілі да генэральнай праве

Плешчаніцы. 9 (ад нашага юнкора). Пры Плешчаніцкім РК КП складзен штаб па правядзеньню генэральнай праверкі выкананьня гаспа чых задач. 8-га ўсе сябры штабу разьехаліся па колгасах раёну. РВ сельсаветы да праверкі не падрыхтаваліся.

РК ЛКСМБ разасланы дэрыктывы па ўсіх ячэйках па пытаньнях нэральнай праверкі.

Пост „Ч. З.“ ГЕЛЬФМАН.

Пачулі сыгналы

Плешчаніцы, 9. (Па тэлефону ад нашага юнкора)—Пасьля сыгналаў „Чырвонай Зьмены“ аб зрыве сьвінагадоўлі ў Плешчаніцкім раёне 2-га кастрычніка дадзен старт эстафэце. У дзень фінішу мяркуецца склікаць зьлёт колгасьнікаў, на якім будзе прысутнічаць каля 2000 чалавек.

Г.

Дапамагаем савгас

Вучні Клічаўскай сямігодкі кую дапамогу аказалі савгасу сета“ ва ўборцы ўраджаю. Та прыклад, за тры працоўныя згрэблі 9 з паловай га к кур сілос, выкапалі 5 га бульбы, сілі 3 з паловай га сенажаці, капалі палавіну га турнэпсу клалі сілосную яму.

Новік

УЗЯЦЬ НА БУКСІР АДСТАЮЧЫХ

Плян асеньняй сяўбы выканан толькі на 85 пр

Плешчаніцы, 8. (Па тэлефону ад нашага юнкора). За выключэньнем колгасаў „Чырвоны Пагранічнік“, „Чырвоны Штандар“, „Зьвязда“, Фрунзэ, Карла Маркса і „Чырвоная Беларусь“ усе колгасы раёну закончылі асеньнюю сяўбу. Засеяна 1910 га, што складае 85 пр. пляну. Пасеўная плошча па на па 15 проц. Ворыва па ідзе вельмі слаба.

За час уборачнай і асеньняй сеўнай кампаніі ў колгасы ўлілося 150 гаспадарак.

Сьвіньні топяцца ў брудзе, а Марозаў—у... гор

У дрэнным становішчы знаходзяцца сьвіньні ў колгасе „Комінтэрн“ Копыскага раёну. Ад бруду гнуць сьвіньні, а праўленьне ніякіх захадаў да ачысткі сьвінарнікаў ня прымае. У сучасны момант намесьнікам старшыні зьяўляецца Марозаў—былы нік і растратчык, які шт п'янствуе і ніякай увагі не тае на гаспадарку колгасу.

Грышчан

Па тэлефону 12-19

Пазаўчора з-за адсутнасьці электрычнасьці загатоўчы цэх Менскай абутковай фабрыкі недавыпусьціў 220 пар абутку. Пасьля работы а 12-ай гадзіне ўночы рабочыя цэху ў колькасьці 60-65 проц. добраахвотна засталіся на працы для ліквідацыі прарыву.

Цалкам засталася на р комсамольская комуна па соўцы, комуна выклейшч комуна па падкладцы па

Пост „Ч. З.“ Бун

Паведамленьні

У мэтах сталай пастаноўкі вучоту добраахвотнікаў, прымацаваных і працуючых пры Цэнтр. Аб'ядн. Бюро Скаргаў НК РСІ БССР, а таксама з мэтай пашырэньня і большага ўцягненьня ў працу БС добраахвотнікаў (лёгкіх кавалерыстых, дэлегатак, рабочых, служачых, студэнтаў) сяброў сэкцый Менскага Гарсавету—бюро скаргаў АЖ РСІ з 5-Х праводзіцца перарэгістрацыя памянёнага актыву і запіс новых добраахвотнікаў, жадаючых працаваць у Бюро Скаргаў.

Перарэгістрацыя праводзіцца днём з 9 да 4 гадзін штодзённа і ўвечары з 6 да 8 гадзін—1, 3, 7, 10, 13 кастрычніка. Акрамя таго, Бюро Скаргаў просіць ФЗМК і парт'ячэйкі даручыць аднаму з адказных партыйных таварышоў правесьці запіс новых добраахвотнікаў, жадаючых працаваць пры Бюро Скаргаў. Аб'яднанае Бюро Скаргаў просіць сваіх рабочых засядацеляў таксама прыняць актыўны ўдзел у рабоце па вярбоўцы.

За Заг. Бюро Скаргаў ЦКК

Наліва

Усім т. т., скончыўш курсы комсамольскага тыву ў 1930 годзе і даслаўшым сваіх адра на апошнія, прапану тэрмінова даслаць адр на курсы КСМ Акт пры Комвузе імя Лен

Фрунзэўскі РК КСМ паве што 10-га, а 7-ай гадзіне ўве памяшканьні яўпэдтэхнікуму заняткі комсамольскай палі Усе запісаўшыяся таварышы, ма і жадаючыя, павінны зьяў яўпэдтэхнікум (Ракаўская вул. сэкратары комсамольскіх ячэ не здалі ў школу сьпісаў ком цаў і беспартыйнай моладзі, іх прадставіць 10-га, а 7-ай

ФРК Л

Адказны рэдактар—Рэдкол

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 5